…ОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . . 30 кап.
3 месяцы . . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 82 (1351) ПЯТНІЦА, 10-га красавіка 1931 г.

АБ'ЯДНАНЫ
ПЛЕНУМ ЦК і ЦКК КП(б)Б
АДКРЫВАЕЦЦА СЁНЬНЯ
а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Комасьветы (клюб ім. Карла Маркса).

ТЫСЯЧАМІ НОВЫХ УДАРНІКАЎ СУТРЭНЕМ ДРУГУЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ

ДА 15 КРАСАВІКА ВЫНАНАЦЬ ПЛЯН КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ ПАСЕВАЎ

…оўнасьцю і ў тэрмін

Сёньня вя…ковая комсамолія прыступае да ажыцьцяўленьня аднаго з …жнейшых рашэньняў 9-га зьезду …сеЛКСМ: „У 6-цімесячны тэрмін да…ца ліквідацыі політняпісьменнасьці …скоага комсамолу“.

…ты і 10-ты зьезды комсамолу ў сваіх …станавах моцна запісалі: „У гэты …рыод разьвіцьця комсамолу павы…ньне тэорэтычнага ўзроўню членаў …сеЛКСМ зьяўляецца аднэй з рашаю…ых умоў замацаваньня дасягнутага ў …ноўным павароту тварам да гаспа…рчага будаўніцтва і ўзьняцьця ра…ты саюзу на больш высокую сту…нь“.

Асабліва зьезд падрэсьліў неабход…днасьць „у 6-цімесячны тэрмін да…ца ліквідацыі політычнай няпісьмен…сьці вясковага камсамолу“.

Прашло ўжо тры месяцы пасьля …ездаў, а ўдарн…х тэмпаў у выка…ньні гэтых пастаноў яшчэ няма.

ЦК КП(б)Б, аналізуючы ў сваёй …станове ад 28-III с. г. стан палітвучо…ы ЛКСМБ, адзначыў, што „ход паліт…учобы ў большасьці раёнаў—нездаваль…ляючы (усяго ахоплена комса…ольцаў рознымі формамі політвучобы …—35 проц., што зьяўляецца вынікам …портуністычнай недаацэнкі значэньня …олітвучобы ў комсамоле з боку …ьсткі РК, колектыву і ячэек, няў…ньне ўвязаць паварот комсамольскай …рганізацыі тварам да выкананьня …аспадарча-політычных задач з шыро…ім разгортваньнем політвучобы, зу…ім слабое кіраўніцтва сыстэмаю ком…сомольскай політвучобы з боку ЦК …КСМБ і РК КП(б)Б, недастатковая …адрых аванасьць пропкадраў, неза…сьпечанасьць політсеткі падручні…амі на белмове і нацмовах)“.

Гэтае рашэньне з усёй яскравасьцю …цьвярджаецца матар'яламі, якія былі …мешчаны ва ўчарайшым нумары на…ай газэты з Вузьдзенскага, Петры…аўскага і Лёзьненскага раёнаў.

Ацэнка стану політвучобы ў бела…ускай комсамольскай організацыі, …аная ЦК КП(б)Б, патрабуе рашучай …арацьбы з опортуністычнай недаацэн…ай значэньня ў броеньня кожнага ком…амольца марксыцкай ленінскай тэо…ыяй, барацьбы з алілуйствам, фар…алізмам, якія ёсьць яшчэ ў радзе …омсамольскіх організацый; патрабуе …еадкладнага пераломy ў выкананьні …астаноў зьездаў аб політвучобе …комсамолу.

Зьмешчаная сёньня пастанова ЦК …УсеЛКСМ зьяўляецца разгорнутай …праграмай, якая забясьпечвае практы…чнае ажыцьцяўленьне пастаноў зьездаў …аб ліквідацыі політняпісьменнасьці вяс…ковага комсамолу. Усе раённыя органі…зацыі ЛКСМБ павінны тэрміновапрысту…піць да рэалізацыі гэтых пастаноў.

Ліквідацыя політняпісьменнасьці вяс…ковага комсамолу ня толькі задача са…мых вясковых організацый, але ў знач…най ступені зьяўляецца задачай і га…радзкіх комсамольцаў.

Гарадзкія камітэты і ячэйкі павінны …неадкладна ўзяцца за мобілізацыю про…пагандыстых у лік 1000; організаваць …пропагандысцкія брыгады, якія-б у вы…хадныя дні дапамагалі сваім пашэф…ным ячэйкам ліквідаваць політня іськ…меннасьць, уключыцца ў абвешчаны …ўсесаюзны двухдэкаднік збору грашо…вых сродкаў для разгортваньня політ…вучобы вясковага комсамолу.

„Чырвоная Зьмена“ абвясьціла месячнік агляду праверкі выкананьня рашэньняў зьездаў аб ліквідацыі політычнай няпісьменнасьці вясковага комсамолу па Лёзьненскай комсамольскай організацыі.

Высланая намі брыгада праверыць, пачынаючы з ячэйкі і канчаючы РК ЛКСМБ, што практычна імі зроблена і як падрыхтована організацыя для таго, каб у 6-цімесячны тэрмін ліквідаваць політ-няпісьменнасьць вясковага комсамолу; як ячэйкі і РК змагаліся з опортуністычнай недаацэнкай політвучобы.

Брыгада практычна дапаможа лепш паставіць політвучобу.

Мы заклікаем усе астатнія РК ЛКСМБ па вопыту „Чырвонай Зьмены“ правесьці ў сваіх раёнах месячнік агляду праверкі выкананьняў рашэньняў зьездаў, наладзіць у сваіх раённых організацыях месячнік самаправеркі, каб гэты месячнік даў пералом у стане політвучобы.

АБ ПРЫЗЫВЕ ЎДАРНІКАЎ ДРУГОГА БАЛЬШАВІЦКАГА СЕВУ

Пастанова орг. бюро УсеЦСПС саюзу рабочых земляробчых саўгасаў і ЦК УсеЛКСМ

Улічваючы аграмаднейшыя задачы другога бальшавіцкага севу, іх рашаючае значэньне для ўсёй народнай гаспадаркі і неабходнасьць хутчэйшага распаўсюджваньня на саўгасы, МТС і колгасы вопыту соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва у прамысловасьці, Орг. бюро УсеЦСПС саюзу рабочых земляробчых саўгасаў і ЦК УсеЛКСМ пастанаўляюць:

1) Адабраючы і падтрымліваючы ініцыятыву перадавых саўгасаў, МТС, колгасаў і комсамольскіх організацый Украіны, Паўднёвага Каўказу і другіх—аб'явіць прызыў ударнікаў другога бальшавіцкага севу.

2) Організацыям саюзу рабочых земляробчых саўгасаў і організацыям комсамолу тэрмінова разгарнуць шырокую масавую работу па растлумачэньню задач прызыву ўдарнікаў і практычна організаваць уцягненьне ва ўдарныя брыгады рабочых саўгасаў, МТС і колгасьнікаў.

Асноўнымі лёзунгамі прызыву ўдарнікаў павінны быць;

а) выкананьне і перавыкананьне плянаў вясеньняга севу ў вызначаныя тэрміны па кольхасных і якасных паказчыках;

б) правільная організацыя працы і вытворчасьці ў саўгасах і колгасах, тэрміновы і поўны пераход на зьдзельную работу, замацаваньне працоўнай дысцыпліны, падвышэньне вытворчасьці працы, зьніжэньне сабекошту продукцыі, уцягненьне рабочых саўгасаў і колгасьнікаў у вытворчае жыцьцё;

в) уцягненьне беднякоў і серадмякоў аднаасобнікаў у колгасы, поўнае скарыстаньне працы колгасьнікаў, рашучая барацьба з утрымацтвам, рвачамі, гультаямі, ілжэўдарніцтвам, выключаючы ўсякую магчымасьць і спробы гультаёў жыць за кошт напружанай работы другіх; на справе ажыцьцявіць разьмеркаваньне прыбыткаў колгасу ў адпаведнасьці з работай, выкананай кожным колгасьнікам:

г) ліквідацыя абязьлічанай язды на трактарах, прымацаваньне трактарыстых да машыны, вывучэньне кожным трактарыстым свайго трактара і прычапных машын; замацаваньне трактарыстых саўгасу, МТС да канца 5-ці годкі; поўнае выкарыстаньне сілы трактара, экономія гаручага, змазкі і інш. матар'ялаў, перавод трактароў на бесьперапынную работу на працягу сутак.

4) Орг. бюро саюзу рабочых земляробчых саўгасаў і ЦК УсеЛКСМ лічаць абавязкам кожнага рабочкому і ячэйкі УсеЛКСМ стаць на чале ініцыятывы рабочых і колгасьнікаў і ўсямерна садзейнічаць замацаваньню аб'явіўшых сябе ўдарнікамі ва ўдарных брыгадах, распрацоўку конкрэтных паказчыкаў соцыялістычнага спаборніцтва, афармленьне соцыялістычных дагавораў і сталую праверку іх выкананьня.


5) ЦК УсеЛКСМ і Орг. бюро лічаць, што пляны вясеньняга севу могуць быць выкананы толькі ўдарнымі тэмпамі і рашучай барацьбою за якасьць. Бальшавіцкія тэмпы плюс якасьць павінны стаць баявым лёзунгам кожнага рабочага саўгасу, МТС і колгасьніка пры выкананьні кожнае работы.

Старшыня Орг. бюро УсеЦСПС саюзу рабочых земляробчых саўгасаў **Аўчыньнікаў**.
Сэкратар ЦК УсеЛКСМ **С. Салтанаў**.

НАКІРАВАЛІ 20 КОМСАМОЛЬСКІХ БРЫГАД

ШКЛОЎ, 6. (Па тэлеграфу).—Шклоўская комсамольская організацыя па-баявому ўключылася ў месячнік пасеўнай трывогі па падрыхтоўцы і правядзеньню другой бальшавіцкай вясны. Мабілізавана 60 чалавек актыву, які разьбіты на 20 брыгад і накіраваны ў ячэйкі для разгортваньня месячніку трывогі.

Сэкратар райкому **Кузьняцоў**



На фронт соцыялістычнага наступленьня

БАЯВАЯ ПРАВЕРКА ВЫТРЫМАНА

БЯГОМЛЯ. З мэтай праверкі падрыхтаванасьці да вясеньняй сяўбы, 28-III-г. г. быў організаваны пробны выезд ў поле ўсіх колгасаў Недальскага сельсавету.

Пробны выезд прайшоў пад лёзунгам шырокай популярызацыі пастаноў 6-га Усесаюзнага зьезду саветаў аб колгасным будаўніцтве і ўсіх дасягненьняў у рабоце колгасаў сельсавету. На поле выехалі ў баявой гатоўнасьці ўсе колгасьнікі. У пробным выезьдзе прынялі ўдзел таксама беднякі і серадцякі-аднаасобнікі.

На мітынгу, прысьвечаным пробнаму выезду колгасу „Комінтэрн“, комсамольцы і колгасьнікі-ўдарнікі правялі заклік у колгас аднаасобнікаў. Тут-жа падалі заявы аб уступленьні ў колгас 12 гаспадарак.

Сельсавет колектывізаваны на 37 проц. У кожнай вёсцы ёсьць колгас.

Пробны выезд паказаў падрыхтаванасьць колгасаў да сяўбы, яшчэ больш замацаваў сувязь з аднаасобным сэктарам.

Я. Бабіцкая

Багушэўскі і Зьмітраўскі сельсаветы выканалі дырэктыву партыі аб кантрактацыі яравых

Мястэчка Бярэзіна. (Па тэлефону).—Плян кантрактацыі яравых пасеваў на 1-IV на 11-ці сельсаветах раёну выкананы на 61,1 проц. Багушэўскі і Зьмітраўскі сельсаветы выканалі плян кантрактацыі поўнасьцю на 100 проц.

Перавозкі, Нагавіцкі, Брадзецкі сельсаветы не закантрактавалі ні аднаго га яравых. Гэтыя сельсаветы не праводзяць масавай работы, бяруць опортуністычную стаўку на самацёк.

РВК 30-га сакавіка мобілізаваў і паслаў у сельсавет для складаньня дагавароў брыгады тэхнічных працаўнікоў.

Брыгада ЦК ЛКСМБ: Цырлін, Бэлах



Брыгада рабочых шэфаў правярае гатоўнасьць сялян да сяўбы

ПАМНОЖЫМ ВОПЫТ ВЯТКОЎЦАЎ

Прыклад конкрэтнай дапамогі

Вытворчая комсамольская ячэйка саматужнікаў г. Веткі ў дапамогу падшэфнаму колгасу „Партызан“ склала брыгаду з 15 чалавек комсамольцаў і рабочай моладзі.

Брыгада з 3-х кавалёў, 2-х калесьнікаў, 3-х шорнікаў, шаўцоў і агітработнікаў, выехаўшы ў Сівенскі с. савет, папрацавала ў колгасе па-ударнаму 3 дні. Праароблена наступная праца: атрамантавана 12 плугоў, 3 станы калёс, 5 хамутоў і 15 дробных рэчаў, 17 пар абутку колгасьнікаў.

Агітбрыгада правяла 3 сходы сялян па пытаньнях бягучых політычна-гаспадарчых кампаній. Распаўсюджана літаратуры на 20 руб., організаваны збор попелу і металялому. Брыгада выпусьціла паходную насьценгазэту.

Колгасьнікі засталіся задаволенымі рабочай брыгадай, дзякавалі комсамольскую ячэйку—організатара гэтай шэфскай дапамогі колгасу.

Брыгадзір: **Вэксьнер, Д**

Лёзьненцы сарвалі кантрактацыю яравых у аднаасобным сэктары

ЛЁЗНА, 6. (Ад нашага юнкора).—„Чырвоная Зьмена“ сыгналізавала аб прарывах Лёзьненскага раёну ў правядзеньні аднэй з важнейшых гаспадарча-політычных кампаній—кантрактацыі яравых пасеваў. Аднак, гэтыя сыгналы раённымі організацыямі ня ўлічаны і прарывы ня выпраўлены.

Партыйна-комсамольская організацыя Лёзьненшчыны, адтрымаўшы перамогу ў ільнозагатоўках, супакоілася і не зьвязала гэтую работу з правядзеньнем кантрактацыі яравых пасеваў.

Згодна пляну па аднаасобным сэктары трэба закантрактаваць льнавалакна—4079 га, а закантрактавана ўсяго 9,9 проц., канапель—38 га, закантрактавана 7,2 проц. Бульба, канюшына і гародніна зусім не кантрактавана.

Добра праходзіць кантрактацыя яравых па колгасным сэктары. Плян кантрактацыі лёну па калгасах выканан на 110 проц. канапель—96,4 проц. бульбы—86 проц.

Паданыя лічбы сьведчаць аб тым, што кантрактацыя яравых пасеваў праводзіцца толькі ў колгасным сэктары, аднаасобнікі-ж выпалі з пад ўвагі. Масавая работа сярод аднаасобнікаў не праводзіцца, адозва ЦК і СНК аб кантрактацыі яшчэ прапрацавана не па ўсіх вёсках.

Гарбукоўскі, Гладаўскі, Вукаўскі і Сутоцкі сельсаветы зусім не вядуць масавай работы ў аднаасобным сэктары, кіраўніцтва гэтых сельсаветаў кінула кантрактацыю на самацёк, выкананьне пляну сарвана.

Рад сельсаветаў (Замшанскі, Беляшкоўскі, Калышанскі) праводзяць права-опортуністычную практыку: не далі кулацка-заможным гаспадаркам, цьвёрдых заданьняў для пасеву лёну, адмовіліся ад націску на кулака.

Райспажыўсаюз падрывае кампанію кантрактацыі. Кантрактанты не атрымліваюць, згодна ўмовы прэміі хлебам і прамтаварамі.

Таксама комсамольская організацыя Лёзьненшчыны не мобілізавалася для ўдарнага правядзеньня кантрактацыі, не разгарнула шырокай масавай работы ў аднаасобным сэктары.

Партыйна-комсамольская організацыя павінна не супакойвацца перамогамі ў выкананьні пляну ільназагатовак, а па-ўдарнаму пераключыцца на кантрактацыю яравых пасеваў, у найкарацейшы тэрмін дабіўшыся 100 пр.

Колгасы, выканаўшы кантрактацыю, павінны ўзяць на грамадзкі буксір аднаасобны сэктар.

К. Кароль.

Школе ФЗВ—10

ДЗЬВЕ СЫСТЭМЫ—ДЗЬВЕ ФОРМЫ

Толькі ў краіне дыктатуры пролетарыяту, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі куюцца соцыялістычныя кадры бальшавіцкіх тэмпаў і спраў



У ІХ
ДЗЕЦІ-ШАХЦЕРЫ

Умовы дзіцячай працы ў „цывілізаваных“ краінах ня так далёка адышлі ад кітайскай сыстэмы.

У капальнях паўночных раё аў Францыі працуе моладзь, пачынаючы з 4-гадовага ўзросту. Ім прыходзіцца штурхаць вагаветкі з грузам у 600 кілё. На тэкстыльных фабрыках працуюць дзеці ва ўзросьце 12—13 год. Атрымоўваюць яны 3 руб. 80 кап. у тыдзень. У горнай прамысловасьці маладыя рабочыя ва ўзросьце 17—18 год атрымоўваюць у сярэднім 7 руб. 60 кап. у тыдзень.

Беспрацоўе асабліва балюча ўдарае па моладзі. 13-гадовыя наогул не атрымоўваюць ніякай дапамогі. Толькі ў 16 год малады рабочы пачынае атрымоўваць дапамогу ў 25 кап. Комфракцыя ўнесла ў парлямант проект закону аб працы моладзі. Вось некаторыя патрабаваньні:

Поўная забарона працы моладзі да 14 год, скарачаньне рабочага дня для падлеткаў, штогодні месячны водпуск, ураўнаньне з дарослымі ў правох на дапамогу, права абіраць і быць абраным у профсаюзныя органы.

„Так павінны змагацца і вы“...

Батракі ў Нямеччыне—найбольш эксплёатаваная частка рабочае клясы. Працуе батрак з раніцы да позьняга вечару. У Саксоніі самая высокая заработная плата батрака—39 пфэнігаў—каля 20 кап. у дзень. Абшарнікі прымушаюць абавязкова працаваць і жонак батракоў. Дзеці батрака, калі яны канчаюць школу, могуць жыць у маёнтку толькі пры ўмовах, калі яны працуюць у абшарніка. Нядаўна абшарнікі абвясьцілі зьмяншэньне заробку батракоў на 30 проц.

12-гадовы піонэр расказвае: „Я хачу вам расказаць аб забастоўцы, у якой я сам прымаў удзел. Летась мы працавалі ў адным маёнтку. Нам плацілі 50 пфэнігаў. Гаспадар пажадаў нам зьнізіць заробак на 35 пфэнігаў. Мы адмовіліся працаваць і ўжо наступны дзень атрымалі зноў па 50 пфэнігаў.

Так павінны і вы змагацца!—заявіў ён.

Сыстэма Муй-Цай
Так завецца гандаль дзяцьмі ў Кітаі

Узрост прадаваных дзяцей хістаецца паміж некалькімі днямі і 7-8 гадамі. Выпрацаваны спэцыяльны тып дагавору паміж прадаўцом і пакупнікам. Цэлы штат маклярoў нажываюцца на пасрэдніцтве пры продажу і пакупцы дзяцей.

Многія з дзяцей нявольнікаў прызначаюцца для „паслуг па доме“. Часьцяком дзяцей воптам скупаюць публічныя дамы і фабрыканты для працы на фабрыках. Праданыя дзеці паступаюць у поўную уласнасьць сваіх гаспадароў.

Толькі ў адным Ганюнгу налічваецца звыш 20 тысяч дзяцей нявольнікаў. Калі ў 1923 годзе ўзьнікла гутарка аб адмене сыстэмы Муй-Цай, рашуча выступілі супроць гаспадары малагодніх нявольнікаў, Ангельскія імпэрыялісты ўспрынялі голас рабаўласьнікаў, як голас народу.

Архіепіскап Кентэрбэрыйскі, які з пенай у роце прапаведвае сьвяшчэнную вайну супроць СССР, дзе па яго словах існуе прымусовая праца, не праяўляе ніякага жаданьня наладжваць крыжовыя паходы супроць рабаўласьнікаў, хоць факт нявольніцтва яму добра вядомы.

Зразумела, ён ніякіх мер ня прыняў. Гэтыя меры супроць рабаўласьнікаў прыме Чырвоная армія Кітаю.

Яны вырасьлі ў сьценах фабзавучу

Гэта быў 1923 год. Добруская папяровая фабрыка „Герой Працы“, якая некалі належала князю Паскевічу, толькі-толькі пачала разгортвацца, аднаўляць зруйнаваную за час грамадзянскае вайны гаспадарку.

І тады Пецька Кульгаўчук—эконом-работнік комсамольскай ячэйкі—абіваў парогі гаспадарчых, профсаюзных і грамадзкіх організацый. „Даёш фабзавуч!“ Такі быў лёзунг комсамолу. Пецька, разам з групай энтузіястых, яго ажыцьцяўляў.

Першыя група лепшых комсамольцаў і рабочай моладзі вучылася без настаўнікаў, без праграм. Днём працавалі на фабрыцы, а ноччу майстравалі сталы, табурэткі, ложкі, зьбіралі капейкі на організацыю комуны і спрачаліся з рабочымі фабрыкі, даводзячы пераваrу ФЗВ перад індывідуальным вучнёўствам.


Так было ў першыя гады жыцьця школы. Адна за адной перамагаліся цяжкасьці. Пасьля вялікіх мытарстваў дабіліся інтэрнату. Зьявіліся настаўнікі. Заводакіраўніцтва выдала спэцвопратку: чорныя шынэлі, боты і цёплыя шапкі.

Закруцілася жыцьцё фабзайцаў: школа, фабрыка, клюб.

Такі быў 23 год.

Няпрыкметна прышоў першы выпуск. 20 маладых рабочых комсамольцаў—камуністых, атрымаўшы вышэйшую кваліфікацыю, занялі камандныя вышыні вытворчасьці.

Іх выхаваў фабзавуч



Зьверху: тав. Васілеўскі, унізе, зьлева направа: т. т. Архіпенка, Гаряінаў, Весялоўскі.

У НАС

Іх портрэты—гэта портрэт рабочага п
летка, гэта портрэт пакаленьня Кастрычні
Вось ён—Юзік Васілеўскі. Яго кваліф
цыя найбольш сур'ёзная—сетачнік. Г
—сэрца папяровай машыны. Ён быў ініц
ятарам сацспаборніцтва на папяровай ф
рыцы „Чырвоная Зорка“. Быў сакратар
райкому ЛКСМБ, і пянер кіру партыйн
організацыяй, Садкін, Саўчанка, Грызел
інш. фабзайцы—сучасныя кіраўнікі буйн
шых парт'ячэек

Ванька Гарэінаў—першы бузацёр і
сяльчак у ФЗВ—зараз стаў гаспадаром паве
Гэта ён комуністы, авіо-тэхнік. Ясік Ве
лоўскі—будучы ваенна-морскі лётнік.

Першыя выхадцы з добрускай ф
рыцы належаць былому арганізатару ком
ны фабзайцаў—Віктару Панову. Адзін
першых фабзайцаў, зараз ён выхадца-ра
цыяналізатар, памочнік загадчыка цэху
нага заводу ваенком фабрычнага коміна
хаваны школай Кастрычніка.

Гісторыя папяровай прамысловасьці
мінулым не ведала жанчыну-рольшчыка.
да важнейшага вагара папяровай прамысло
васьці—рольнага аддзяленьня прышла пе
шая комсамолка—фабзавучніца Ніна Агран
віч. Жывая, чарнавокая, сьмела ардую
вяслом, дзялоўжай і сьцерай, яна крок
крокам разьбівала консэрватыўныя адносін
да жанчыны-рольшчыка. За ёй пасьледа
другія.

Рассыпаны фабзайцы па ўсёй Беларус
па ўсёй Эсэсэры, Спытайце ў кожнага фі
культурніка і ён вам раскажа аб Міко
Архіпенку, ідэолёгу фізкультарганізацы
БССР, аб былых юнкорах „Чырвонай Зьме
ны“ зараз ваенных працаўнікоў—Сусьман
Масакленку і інш.

Першы выпуск Добрускага фабзавучу д
20 чал, другі—16, а зараз ён налічвае кал
300 вучняў.

Ад двух пакояў на задворках старога клю
бу, якія называліся агульнажыцьцём
1923 годзе, зараз вырасьлі два гіганты—бу
дынкі, інтэрнаты з лябараторыямі, ленінскі
мі куткамі і г. д.

Расьце фабзавуч папернікаў, і кіруюць іх былыя фабзайцы. Інструктары—Авбіндэр, Клейнатоўскі, Асадчы, Катляроў—атрымалі політычнае і вытворчае выхаваньне ў сьценах гэтага фабзавучу.

Э. Каганская.

Дзьве сыстэмы

А 2, 3, 4 гадзіны раніцы 9-10-гадовых дзяцей адрываюць ад іх брудных ложкаў і прымушаюць за адно толькі нікчэмнае пракарміленьне працаваць да 10-11-12 гадзін, дзякуючы чаму цела іх замаруджваецца, служыць, цела сохне, рысы твару набываюць тупы выраз, і ўся істота дзервянее ў немай нярухомасьці, адзін выгляд якой прыводзіць у жах“ (Маркс).

Маркс паказвае, як машына ў капіталістычнай сыстэме ня цягне за сабой выкіданьне мільёнаў дарослых рабочых і замену іх жаночай і дзіцячай працай, больш таннай. „Жаночая і дзіцячая праца была першым словам капіталістычнага ўжываньня машын“ (Маркс).

Уцягваньне мільёнаў дзяцей і падлеткаў у вытворчасьць зьяўляецца адным з верных сродкаў зьніжэньня заработнай платы, падоўжаньня рабочага дня і ўзмацненьня нормы эксплёатацыі. Навучаньне дзяцей і падлеткаў, сыстэма вучнёўства, цалкам падпарадкаваны мэтам эксплёатацыі і выцісканьня найбольшай дадатковай вартасьці.

Дзеці і падлеткі ў большасьці выпадкаў выкарыстоўваюцца, як некваліфікаваная рабочая сіла, і таму называюцца „пераданымі“ сыстэмай навучаньня лічыцца амэрыканская, фордаўская. Форд навучае падлетка аднэй нескладанай опэрацыі на працягу аднаго-двух дзён, а потым прымушае гэтага-ж падлетка гадамі выконваць гэтую прытупляючую працу.

Такім чынам, фордаўская сыстэма падрыхтоўкі кадраў змалку ператварае рабочага ў просты прыдатак да машыны.

Побач з „навучаньнем“, якое практыкуецца ў найбольш перадавых, механізаваных прадпрыемствах, шырока ўжываецца ў дробнай і сярэдняй прамысловасьці шматгадовае вучнёўства. Гэта сыстэма асабліва распаўсюджана ў Нямеччыне і Англіі. Тут вучнёўства зьяўляецца ні чым іншым, як бессаромнай эксплёатацыяй і амаль дарэмным выкарыстоўваньнем дзіцячай працы.

У Нямеччыне няма ніякай устаноўленай аплаты вучняў. Гаспадар плаціць вучню столькі, колькі яму ўздумаецца. І назва для гэтага прыдумана ўдалая. Вучань атрымоўвае не заработную плату, а „дапамогу на навучаньне“. У Польшчы шырока практыкуецца дарэмнае вучнёўства. Часта бываюць выпадкі, калі бацькі нават даплачваюць за тое, што прадпрыемца бярэ іх дзяцей на вучобу. У Англіі тэрмін вучнёўства цягнецца 7 год, і ўвесь гэты час фабрыкант бескантрольна распараджаецца рабочым падлеткам.

А на сканчэньні тэрміну навучаньня падлетка ўжо сыпераже... беспрацоўе. Ва ўмовах крызісу капіталістам нявыгадна трымаць абучанага падлетка, якому трэба даражэй плаціць. І ён яго замяняе новым вучнем“

Вось чаму, ня гледзячы на замену дарослых рабочых падлеткамі, беспрацоўе расьце і сярод моладзі. У Нямеччыне зараз 600 тысяч беспрацоўнай моладзі у Англіі—500 тысяч.

Капіталісты ў пагоні за дадатковай вартасьцю імкнецца павялічыць рабочы дзень. 9, 10 і 11-гадзіны рабочы дзень—звычайная зьява на капіталістычнай фабрыцы.

У Пенсыльваніі (Амэрыка) 8-гадовыя дзеці працуюць у капальнях пад зямлёю 10-12 гадзін. На заводах у Аусбургу (Нямеччына) рабочы дзень падлеткаў працягваецца да 18 гадзін. Яшчэ горшае становішча дзяцей і падлеткаў у сельскай гаспадарцы. Маленькія батракі працуюць з самай раніцы да позьняга вечару.

Сыстэма эксплёатацыі пераплеце на з сыстэмай выхаваньня пакорлівага работніка. У дагавор з прадпрыемцам устаўляецца пункт, па якому вучань абавязваецца ня ўдзельнічаць у забастоўках, слухацца гаспадара. За паслухмянства і „добрыя“ паводзіны вучань атрымлівае розныя падачкі. На дапамогу гаспадару прыходзяць і соцыял - дэмократычныя організацыі моладзі, мэта якіх—адцягнуць вучня ад клясавай барацьбы.

Але калі ў культурных капіталістычных краінах прымусовая праца падлеткаў і дзяцей яшчэ прыкрыта фігавым лісьцікам буржуазных вольнасьцяй дык у колёніях і паўколёніях прыгон моладзі выступае ва ўсёй сваёй нагаце. Гандаль дзіцячым таварам у Кітаі, Афрыцы—такі паважаны занятак, як продаж опіуму і гандаль хрысьціянскімі дабрачыннасьцямі.

Машына ва ўмовах соцыялістычнай гаспадаркі аблягчае працу работніка, памяншае рабочы дзень, дае нябывалы рост вытворчых сіл, павялічвае грамадзкае багацьце і паляпшае матар'яльны дабрабыт працоўных мас. Вось чаму мэханізацыя і рэконструкцыя нашай гаспадаркі прывялі да ўцягненьня ў народную гаспадарку новых мільёнаў працоўных. Вось чаму СССР—краіна з найбольш кароткім, 7-гадзінным рабочым днём. Вось чаму СССР—адзіная краіна ў сьвеце, дзе ліквідавана беспрацоўе, дзе з году у год расьце матар'яльны дабрабыт працоўных.

Усё гэта вызначае сыстэму навучаньне і выхаваньня дзяцей і падлеткаў у нас.

Фабзавуч, які сёньня спраўляе сваё 10-годзьдзе, і зьяўляецца тыпам соцыялістычнай політэхнічнай школы, якая аб'ядноўвае вытворчую працу з тэорэтычным навучаньнем. Фабзувуч—тып школы, дзе праца падлеткаў цалкам падпарадкавана выхаваньню і навучаньню.

Калі ў аснове вучнёўства пры капіталізьме ляжыць эксплёатацыя дзіцячай працы, дык ў аснове нашай сыстэмы навучаньня ляжыць падрыхтоўка ўсебакова-разьвітых організатараў соцыялістычнай гаспадаркі. Капіталізм рыхтуе сабе толькі пакорлівых, пас- лушных работнікаў, жывых прыдаткаў к машыне. Мы рыхтуем гаспадароў вытворчасьці, якія павінны кіраваць ёю, плянаваць і рацыяналізаваць яе.

Параўнайце наш фабзавуч і капіталістычны. У іх вучні—маладыя рабочыя—працуюць 10, 12 і больш гадзін.

У нас—падлетак, які навучаецца ў фабзавучы, працуе 4 ці 3 з пал. гадзіны на вытворчасьці. Астатнія 4 гадзіны ён аддае тэорэтычнай вучобе.

У іх жабрацкая аплата вучняў і нават дарэмнае вучнёўства. У нас—абавязковы перавод фабзавучнікаў кожнае паўгодзьдзе ў вышэйшы разрад, няўхільны рост заработнай платы вучняў.

У іх—вучань, які канчае тэрмін вучнёўства—прысуджан на беспрацоўе.

У нас—хлопцы, якія канчаюць фабзавуч займаюць самыя пачэсныя камандныя пасты на вытворчасьці і зьяўляюцца лепшымі кваліфікаванымі брыгадзірамі, майстрамі і рацыяналізатарамі вытворчасьці.

У іх—сотні тысяч беспрацоўнай моладзі.

У нас—ліквідавана беспрацоўе і сярод моладзі. Сёлета мы уцягваем у фабзавучы 700 тысяч падлеткаў, прычым палова іх прыдзе з вёскі.

10-годзьдзе ФЗВ—урачыстасьць соцыялістычнай школы. Недарма гэта 10-годзьдзе супадае з III годам пяцігодкі, калі мы ў асноўным завяршаем пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Соцыялістычная школа гэта адзін з складнікаў вялікай сумы, што завецца соцыялізмам.

Э. Эстрава.

Фабзавуч!

ЖЫЦЬЦЁ ТВАРЫЦЬ, ЗА СОЦЫЯЛІЗМ ЗМАГАЦЦА— ВОСЬ ШТО ПАРТЫЯЙ ДАРУЧАНА ТАБЕ



„Кімаўцы" далі 104 проц.

У маі месяцы 1930 г. была адчынена кузьня кадраў для швэйнай прамысловасьці—ФЗВ імя „КІМ'у". Фабрыка-школа ўжо шмат зрабіла ў галіне падрыхтоўкі кадраў для социялістычнай прамысловасьці.

Комсомольская ячэйка стала ініцыятарам організацыі школьнага жыцьця, практычным організатарам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Зараз, да 10-годзьдзя ФЗВ, школа абвясьціла вытворча-навучальныя манэўры.

Комсамолія фабзавучу расьце з кожным днём і з посьпехам выконвае лёзунг: „100-проц. рабочай моладзі—у комсамол". Да 10-цігадовага юбілею 75 вучняў школы падалі заяву аб уступленьні ў комсамол.

З 70-ці комсамольцаў у час організацыі школы, комсамольская організацыя вырасла да 200 комсамольцаў, і зараз праводзіцца значная праца па уцягненьню беспартыйнай моладзі ў комсамол.

За час існаваньня школы адбыліся 3 наборы. Школа налічвае 800 вучняў. Зараз праводзіцца падрыхтоўчая праца да прамполітбою, якая ўвязваецца з выкананьнем прамфінпляну і навучальных програм школы.

Колектыў школы пад кіраўніцтвам комсамольцаў датэрмінова выканаў прамфінплян на 104 проц. Організаваў штурмавыя ўдарныя брыгады, буксір, мобілізаваў усіх вучняў школы навокал выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

ФЗВ імя КІМ'у вытрымаў экзамен кузьні сьвядомых соцыялістычных кадраў.

Адначасова з гэтымі дасягненьнямі, школа мае рад недахопаў. Навучальныя програмы не даведзены да вучняў. Рад дысцыплін не політэхнізаваны. Комсамольскі колектыў ФЗВ зараз бярэ на буксір навучальную частку школы.

Бытавыя абставіны вучняў з кожным днём пал пшаюцца, але-ж яшчэ і зараз начны недахоп інтэрнатаў. Памяшканьне школы не дае магчымасьці належным чынам разгарнуць грамадзкую працу ў школе. 800 вучняў ня маюць свайго клюбу.

Да 10-га юбілею ФЗВ мы патрабуем большай увагі з боку Гаркому комсамолу і Белшвэйтрэсту.

Мы патрабуем, каб гарсавет аддаў школе памяшканьне кр м МЦРК, якое належыць школе-фабрыцы, каб даць магчымасьць яшчэ большым разгортваньнем па-зашкольнай працы мобілізаваць усіх вучняў школы на выкананьне пляну.

Кімавец і надалей будзе выконваць пастанову партыі зрабіць ФЗВ сапраўднай кузьняю кадраў.

Н. Каган, Х. Бракскі.

Будвуч—гэта:

130 ударнікаў, 16 ударных брыгад

Белыя сьцены. Памяшканьне, поўнае дыму. Працуем бяз усякіх програм, як давядзецца. У вучняў незадаваленьне. Шмат непарадкаў. Гаспадарнікі вельмі дрэнна адносяцца да будвучу. Не даюць працы.

Па вучобе ня лепш

Гэтак было два гады таму назад.

Зараз будвуч Мендзяржбуду—адна з буйнейшых адзінак падрыхтоўкі кваліфікаванай рабсілы для будаўніцтва. Ужо зараз, дзякуючы стараньню вучняў будвучу, сваячасова скончаны цэлы рад аб'ектаў.

Зараз будвуч гэта—130 ударнікаў, 16 ударных брыгад. Соцспаборніцтва, ударніцтва ў штодзённай працы.

У будвучы пачаліся вытворчыя манэўры на будаўніцтве, якія зараз праводзяцца комсамольскім колектывам Мендзяржбуду. Менская кантора Мендзяржбудаб'яднаньня прэміявала 50 вучняў школы.

У ліку прэміяваных рабочых будаўнікоў-вынаходцаў—вучні будвучу.

Будвуч сёньня значна адрозьніваецца ад будвучу былога.

Будвуч расьце.

Сёма Крыткоўскі.

Раўняцца па лепшых

З пастановы прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР

Надаючы вялікае значэньне школам ФЗВ у вырашэньні задач падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых кадраў, прэзыдыум ВСНГ БССР пастанаўляе:

У адзнаку дзесяцігодзьдзя ФЗВ, выдзеліць пяць прэмій для прэміяваньня лепшых школ, як-та:

Об'ект патрэбнага будаўніцтва (звыш вызначаных лімітаў на капітальнае будаўніцтва) школ ФЗВ за кошт фондаў Аддзелу Кадраў і г. д.

Ускласьці на заводакіраўніцтва адказнасьць за якасьць падрыхтоўкі кадраў праз ФЗВ, дзеля чаго абвязаць іх прымаць актыўны ўдзел у пастаноўцы ўсёй працы школы (вытворчае і тэорэтычнае навучаньне, грамадзка-політычнае выхаваньне і г. д.).


Капітальнае будаўніцтва школ ФЗВ лічыць ударным і пазачарговым.

Усім аб'яднаньням і прадпрыемствам замацаваць за школамі ФЗВ пэўную частку новага абсталяваньня, якое прадпрыемствы атрымаюць на працягу 1931 г.

Заводакіраўніцтвам, сумесна з фабзаўкомамі і ячэйкамі ЛКСМБ, распрацаваць практычныя мерапрыемствы для далейшага пашырэньня школ ФЗВ з тым, каб яны рыхтавалі ў першую чаргу кваліфікаваных рабочых найбольш дэфіцытных профэсій.

Лічыць мэтазгодным склікаць Усебеларускую конфэрэнцыю школ ФЗВ, даручыўшы сэктару Прамкадраў устанавіць тэрмін скліканьня і абвестку дня.

Да юбіляру



Уг обілі...

ЗА АСНОЎНЫ ЦЭХ ПРАДПРЫЕМСТВА

З пастановы прэзыдыуму ЦСПСБ аб Х-годзьдзі фабзавучу

10 год існаваньня ФЗВ—гэта 10 год барацьбы за соцыялістычныя формы організацыі моладзі ў вытворчасьці, гэта 10 год барацьбы пад кіраўніцтвам партыі за „злучэньне аплачв най вытворчай працы з разумов м раз віцьцём, са значным практыкаваньнем і політэхнічнай падрыхтоўкай" (Маркс).

За 10 год школы ФЗВ далі соцыялістычнай прамысловасьці дзесяткі тысяч кваліфікаваных рабочых і работніц. З асяродзьдзя фабзавучнікаў вышлі першыя застрэльшчыкі новых мэтодаў соцыялістычнай працы—соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Усё гэта дашчэнту разьбіла права опортуністычныя разважаньні і практыку мінулага кіраўніцтва УсеЦСПС. Наркампрацы СССР і паасобных гаспадарнікаў. ФЗВ зараз цалком прызнаны як асноўная форма падрыхтоўкі кадраў кваліфікаваных рабочых.

Прэзыдыўм ЦСПСБ адзначае асобую ролю Ленінскага Комсамолу Беларусі, які пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі правёў вялізарную барацьбу з опортунізмам закаранеласьцю і недаацэнкай ролі ФЗВ у падрыхтоўцы высока-кваліфікаваных кадраў для соцыялістычнага будаўніцтва.

Надаючы асаблівае палітычнае значэньне 10-годзьдзю ФЗВ. Прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Школа фабрычна-заводзкага вучнёўства павінна зьявіцца адным з асноўных цэхаў прадпрыемства. Поўная адказнасьць за пастаноўку працы ўскладаецца на адміністрацыю і фабзаўмясцком прадпрыемства.

Фабзавуч за свае 10-ць год давёў ня толькі сваю жыцьцёвасьць, але і заняў першае месца, як асноўная форма падрыхтоўкі кадраў пролетарыяту і зараз павінен ахапіць усё індывідуальнае і брыгаднае вучнёўства, што ёсьць яшчэ на прадпрыемствах БССР, форсуючы тэмпы разьвіцьця ФЗВ

У адзнаку 10-ці годзьдзя ФЗВ абвясьціць прыём мя 10-цігодзьдзя лепшых фабзавучнікаў ударнікаў, якія прымаць актыўны ўдзел у жыцьці прадпрыемстваў і ФЗВ, у профсаюзы

2. Улічваючы задачу падрыхтоўкі праз ФЗВ кляс ва сьвядомага рабочага, з марксыстка-ленінскім сьветапоглядам і звычкамі ў кавешай замежнай тэхніцы, прэзыдум лічыць паставіць пытаньне перад ВСНГБ аб утварэньні спэцыяльнага фонду рацыяналізацыі імя 10-годзьдзя для фабзавучаў.

3. Асаблівую ўвагу профорганізацыі павінны ўдзяліць на капітальнае будаўніцтва ФЗВ

Прэзыдыум прапануе ўсім фабрычна-заводзкім камітэтам, у межах якіх будуюцца новыя, альбо рэконструююцца старыя школы, організаваць групу кантролю за сваячасовым выкананьнем пляну будаўніцтва новых школ і іх абсталяваньня з прадстаўнікоў ФЗК, комсамолу і гаспадарчых організацый.

4. Улічваючы недахоп належнага інструктарскага пэрсоналу, асабліва ў сувязі з правядзеньнем лютаўскага набору ў ФЗВ, Прэзыдыум ЦСПСБ абавязвае ўсе профорганізацыі вылучыць 50 лепшых, старых, высока кваліфікаваных рабочых-ударнікаў на сталую работу ў якасьці інструктароў ФЗВ.

Прэзыдыум ЦСПСБ устанаўляе пераходны сьцяг імя 10-годзьдзя ФЗВ

5. З 5-га па 25-е красавіка 1931 г. правесьці двухдэкаднік абсталяваньня школ ФЗВ,

маршам



Абяцалі...

разгорнутым



Далі...

„Сілу і жыцьцё аддам за варштат"

Ударніца-фабзавучніца Рагожына

Ударніца—фабзавучніца Яцэвіч

— Я памятаю,—пачаў Матвей Жыткоўскі,—як ў 1923 годзе сабралі нас, групу рабочых падлеткаў з гомельскага заводу „Ланцуцкага", і рашылі організаваць фабзавуч. Пачынаньне здавалася недарэчнымі сьмешным: былі толькі тры пары сапсаваных, нікуды ня вартых сьлясарных цiскоў, і толькі. Ня было нават памяшканьня. Але хлопцы ня тужылі, з агеньком узяліся за працу. Разам з двума рабочымі заводу, што былі вылучаны на пасады інструктароў, бегалі фабзайцы ў пошуках хаця-б малюсенькай жылплошчы для майстэрні, рыліся ў грудах лому, бруду, шукалі частак для організацыі майстэрань.

— Было цяжка, вельмі цяжка. Але хлопцы ўпартыя. Яны дабіваліся свайго: ва што-б там ні стала організаваць фабзавуч.

Адміністрацыя заводу адбівалася:

— Яшчэ няшчасьце на сваю галаву. І так дрэнна на заводзе, а вы як смала аб нейкім фабзавучы.

Аднак хлопцы рук не апускалі, упарта напіралі. І вось—першая перамога: фабзавучу далі майстэрню.

. . . У дзіразую, ня то кладовую, ня то накшталт яе, фабзавучнікі пачалі цягаць усякае рызьзё, якое толькі магло хаця-б на што-колечы прыдацца. Часта прыходзілася адрывацца ад працы. Бывала пачне ліць мала-малейшы дождж—з даху руччом вада:

— Дах ад сонца, а не ад дажджу,—сьмяяліся фабзавучнікі, закрываючы фанерай дзіравы дах.

Праўда, сёньня гэта здаецца сьмешным, але так было. Успомніш, дык неяк ня верыцца, як гэта магло ўсё так перамяніцца.

Матвей Жыткоўскі скончыў. Трыбуну займалі адзін за адным фабзайцы-ударнікі, што рыхтуюцца для пасьпяховага наступу, для аўладаньня колькаснымі і якаснымі паказчыкамі прамфінпляну.

— За добрую працу па тэорыі і практыцы прэміруецца касьцюмам ударнік Круцько. За ім ідуць: Подзьзе, Барысенка і шмат іншых. Дзесяткі ўдарнікаў прэміююцца.

Вольга Якэвіч—ударніца, як і ўся школа, яна—токар.

— Варштаты, што знаходзяцца ў школе,—кажа Вольга засталіся з часоў „цара Гароха" і скачуць казламі, баішся, каб работа не сапсавалася. Але гэта ня значыць, што калі цяжка, дык ня трэба працаваць: наадварот, неабходна па прыкладу старых фабзавучнікаў перамагаць цяжкасьці, давесьці, што ня гледзячы на ўсе рагаткі мы можам і будзем працаваць, усе сілы і жыцьцё аддамо за варштат...

Гучныя воплескі, у якіх патанула вялізная заля, не далі магчымасьці дагаварыць Вользе. Мы зірнулі на сцэну: там фабзавучнік Багамолаў, адзін з бузацёрыстых хлопцаў, выступаў з адказным словам ад імя гомельскіх фабзавучнікаў:

Фабзайцы—во! (ён паказаў вялікі палец правай рукі) Хлопцы на вялікі палец! **Пацукоў,—зараз Орг. аддзелу ЦК ЛКСМБ, Малей—інструктар бел. бюро ЦК чыгуначнікаў, Гурэвіч і Сідарук—у „Чырвонай Зьмене", Матвей Жыткоўскі—пам. загадчыка школы ФЗВ. Ліцкевіч Ніна—нейкай шышкай у раённай страхкасе. Васілеўскі Валодзя—самы бузацёрысты з фабзавучнікаў—брыгадзір лепшай ўдарнай брыгады заводу імя Ланцуцкага...**

Прамова зусім простая, словы слізкія і праўдзівыя...

24—гэта лічба вучняў першых дзён існаваньня Гомельскага ФЗВ чыгуначнікаў. 1200—лічба на сёньнешні дзень. 24 і 1200,—якая розьніца!

Вырас і акрэп фабзавуч за час свайго існаваньня, за час упартай бязьлітаснай барацьбы комсамолу з усімі тымі, хто недаацэньваў фабзавуч

Перамога—на вачох. Можаце ўпэўніцца: 24 і 1200 яскравей за ўсё аб гэтым гавораць.

Цішка Верны.

Правяраем рашэньні IX і X зьездаў комсамолу

НЕ ІГНАРАВАЦЬ РАШЭНЬНІ ЗЬЕЗДАЎ

Полацкая організацыя комсамолу яшчэ не разгарнула вайсковую работу

„У шэрагах комсамолу не павінна быць месца тым, хто не даацэньвае неабходнасьці вайсковай падрыхтоўкі“ (IX зьезд УсеЛКСМ)

9-ы Усесаюзны зьезд комсамолу сказаў: „той актывісты—не актывісты і той комсамолец—некомсамолец, які ня мае самых элемэнтарных ведаў па ваенізацыі. Між тым, да гэтага часу мы наглядаем вялікую бязьдзейнасьць некаторых комсамольскіх організацый у вайсковай падрыхтоўцы.

Аб гэтым з усёй яскравасьцю гавораць зьмешчаныя ў сёньнешнім нумары матар'ялы з некаторых раёнаў і ячэек БССР.

Вялікая частка комсамольскага кіраўніцтва камітэтаў і ячэек не даацэньвае вайсковай падрыхтоўкі. Рашэньне 9-га зьезду УсеЛКСМ і 10 зьезду ЛКСМБ, а таксама маршруты баявой падрыхтоўкі, высунутыя „Комсомольской Правдой“, да гэтага часу шмат кім не праводзяцца ў жыцьцё.

Рад комсамольскіх ячэек ня выканаў задач першага маршруту і ў прыватнасьці 100 проц. ахопе і ўступленьні комсамольцаў у Асоавіяхэм і Аўтодар.

Мы лічым бясчынствам, што ў Барысаўскім раёне опортуністычнае кіраўніцтва, замест мобілізаваць комсамольскія масы вакол выкананьня рашэньняў комсамольскіх зьездаў, распусьціла курсы па вайсковай падрыхтоўцы. Мы таксама ня можам абыйсьці моўчкі таго факту, што ячэйка МРВ пас. правaліла набор у вайсковыя школы толькі таму, што ня была праведзена належная растлумачальная работа вакол гэтага мерапрыемства.

„У шэрагах комсамолу не павінна быць месца тым, хто не даацэньвае неабходнасьці вайсковай падрыхтоўкі, і тым хто не вядзе штодзенна вайсковай работы“ (з рэзолюцыі IX зьезду УсеЛКСМ па справаздачы ЦК УсеЛКСМ).

Абмежаваліся дакладамі

Чыгуначная ячэйка „ШРВ“ пасажырскай—яскравы паказчык таго, наколькі комсамольскі колектыў Менскага вузла нядбайна адносіцца да вайсковай справы.

Аб маршрутах баявой падрыхтоўкі „толькі заслухалі даклад,“ але-ж аб іх ніхто нічога ня ведае.

Аб колькасьці комсамольцаў, членаў асоавіяхэму, сэкратар ня ведае. „Я гэтым не займаўся, а высьветліць гэта можна толькі шляхам апросу кожнага комсамольца“.

Колькі комсамольцаў ахоплена вайсковай вучобай, сэкратар ячэйкі таксама ня ведае.

Аб мэтадах сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў вайсковай працы ячэйкі гаварыць ня прыходзіцца.

Вучпрофсож не дапамагаў прыцягваць рабочую моладзь да вайсковай вучобы.

Падшэфнай часткай ячэйкі зьяўляецца 3-я вучэбная батарэя Н-скага арт. палка. Уся дапамога падшэфнікаў у галіне ваенізацыі выражаецца толькі ў дакладах.

Комсамольскі колектыў і Гаркамол зусім ня кіруюць комсамольскай ячэйкай у галіне вайсковай работы.



На вайсковых занятках

Трывожныя сыгналы з Полаччыны

Комсамольская організацыя Полаччыны не пераключылася на баявыя рэйкі для ажыцьцяўленьня рашэньняў комсамольскіх зьездаў у галіне вайсковай падрыхтоўкі.

У такім комсамольскім колектыве, як гута „Труды“, дзе налічваецца звыш 200 комсамольцаў і вялікая колькасьць рабочае моладзі, вайсковая работа зрываецца.

Вайсковы куток пры гуце—у поўным заняпадзе. Вайсковай вучобай ніхто ня цікавіцца і куток ператварыўся з вайсковага ў... шахматна-шашачны.

Комсамольскі колектыў нічога не зрабіў, каб правесьці набор у вайскова-тэхнічныя школы, а якраз у колектыве наглядаецца туды цяга. Комсамольскі колектыў не садзейнічаў нават і тым комсамольцам, якія добраахвотна хочуць паступіць у вайсковую школу.

Ня лепш з вайсковай вучобай у іншых ячэйках і колектывах Полаччыны. Бюро Гаркому ЛКСМБ недаацэньвае ваеннай падрыхтоўкі і ніякіх дырэктыў не дае.

Бюро РГК ЛКСМБ Полаччыны, як відаць думае паставіць сябе ў „позу“ унтэр-офіцэрскае удавы, якая сама сябе высекла“—(Косараў на 9-м зьезьдзе УсеЛКСМ.)

Мятла.

Мала высунуць ідэю, трэба дапамагчы яе ажыцьцявіць

На перадавыя позыцыі

30 красавіка „Чырвоная Зьмена“ высунула лёзунг: „Ліквідуем абязьлічку ў колгасах і саўгасах“. Пад гэтым-жа лёзунгам газэта высунула і рад практычных мерапрыемстваў для барацьбы супроць абязьлічкі. 3 красавіка ў рэдакцыі „ЧЗ“ адбылася нарада спэцыялістых, якія цалкам ухвалілі гэтыя мерапрыемствы.

Каб практычна дапамагчы комсамольскім ячэйкам і колгасам рэалізаваць лёзунг ліквідацыі абязьлічкі, рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ накіравала ў Лёзьненскі раён спэцыяльную брыгаду пад кіраўніцтвам агранома, супрацоўніка рэдакцыі.

Перад брыгадай пастаўлены задачы:

Дапамагчы колгасам падрыхтавацца да вясеньняй сяўбы.

Скласьці конкрэтны вытворчы опэрацыйны плян работы колгасу.

Дабіцца правільнай расстаноўкі рабочай цягавай сілы, ашчадных адносін колгасьнікаў да маёмасьці і інвэнтара.

Павісыць вытворчасьць і якасьць працы і працоўную дысцыпліну.

Організаваць брыгады колгасьнікаў для выкананьня паасобных відаў работ у час вясеньняй пасеўнай кампаніі і ўсяго гаспадарчага году.

Перавесьці ўсю працу колгасаў на зьдзельшчыну і аплату па працаднёх і якасьці працы.

Разам з гэтым, брыгада на практыцы перанясе ў колгас вопыт добра організаванай работы колгасу „Гігант“ (Украіна) з тым, каб гэты вопыт пасьля быў перанесены ва ўсе колгасы Беларусі.

Брыгада дапаможа комсамольскай організацыі практычна ажыцьцявіць рашэньні 9 зьезду УсеЛКСМ аб тым, што „кожны комсамолец-колгасьнік павінен быць організатарам мас на справу соцыялістычнай перабудовы вёскі, ударнікам-рацыяналізатарам, які даваў-бы рэкордныя нормы выпрацоўкі“.

Праз тыдзень „Чырвоная Зьмена“ пачынае сыстэматычна асьвятляць практыку працы па ліквідацыі абязьлічкі ў колгасе Лёзьненскага раёну.

У БАРАЦЬБЕ ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ...

„Адданасьць вясковага комсамольца соцыялізму вымяраецца раней усяго яго ўступленьнем у колгас і яго актыўнай работай над умацаваньнем колгасу“ —так сказаў у сваім дакладзе тав. Салтаваў на 9-м зьезьдзе.

Прапрацоўваючы гэтыя важнейшыя рашэньні, комсамольскія організацыі № ...аўдывізыі па-бальшавіцку ўзяліся ня толькі за іх усвойваньне, але і за конкрэтнае выкананьне іх.

Організацыя № кавалерыйскага палка мела ў сваім складзе 41 комсамольца-аднаасобніка. Такое становішча было прызнана ненормальным. „Разгарнуць работу, зрабіць аднаасобнікаў колгасьнікамі“—так рашыла бюро і ўся організацыя.

Праводзячы падрыхтоўчую растлумачальную работу напярэдадні гадавіны Чырвонай армії, Бюро колектыву сабрала ўсіх комсамольцаў аднаасобнікаў. Сход усебакова абгаварыў гэты пункт і рашыў: „усім комсамольцам-аднаасобнікам уступіць у колгасы, аб чым падаць належныя заявы і паслаць па месцу жыхарства“.

Сказана—зроблена. З 41 чалавека 15 ужо уступіла ў колгасы. З 15-ці месц адказы яшчэ не паступілі, але і гэтыя будуць колгасьнікамі.

Вось яшчэ адзін яскравы ўзор. Комсамолец Мазырчук на пасланую ім заяву атрымаў ад бацькоў адказ: „не жадаем быць у колгасе і цябе ня раім“.

Комсамолец Мазырчук не разгубіўся, другі раз напісаў ліст, яшчэ растлумачыў. Аднак нічога не дапамагае, бацькі ня слухаюць.

Мазырчук ня можа выступаць супроць рашэньняў 9-га зьезду комсамолу, і піша ў сельсавет наступную заяву:

„Вылучце частку маёй маёмасьці і перадайце існуючаму колгасу. Жадаю адразу з арміі прыехаць колгасьнікам. Адгэтуль лічэце мяне сябрам вашага колгасу“

Комсамольцы каўпалка на гэтым сваю работу скончылі. Яны добра ведаюць аб тым, што комсамолец абавязан правесьці работу з беспартыйнымі чырвонаармейцамі, якія яшчэ не зьяўляюцца колгасьнікамі. Таму па эскадронах, па ўзводах—за работу!

У выніку толькі па 4-му эскадрону 24 чалавекі ўступіла ў колгасы.

Работа, зьвязаная з падрыхтоўкай да бальшавіцкай сяўбы не прайшла міма комсамольскай організацыі палку. Масавы сэктар комсамольскай організацыі ўзяўся за тое, каб усе комсамольцы паслалі лісты да хаты аб значэньні бальшавіцкай сяўбы, танныя бібліотэчкі з літаратурай аб другой бальшавіцкай.

Комсамольцы палкавой школы першыя адгукнуліся і закупілі яшчэ танныя бібліотэчкі. Шляхам соцыялістычнага спаборніцтва ўся організацыя палка была ўцягнута ў распаўсюджваньне літаратуры сярод беспартыйных таварышоў.

Але ня толькі ў чырвонаармейскай казарме комсамолец змагаецца за генэральную лінію партыі.

Выяжджаючы на практычныя заняткі на вёску комсамол дапамае парторганізацыі праводзіць работу па колектывізацыі.

На апошніх практычных занятках, дзякуючы праведзенай рабоце, новыя адна собнікі ўступілі ў колгас.

Вось яшчэ прыклад. Сэкратар ячэйкі комсамолу, тав. Машынін, які ехаў на дзесяць сутак да хаты ў вёску Усохі, Людынаўскага раён. (Зах. обл.), за так кароткі тэрмін, дзякуючы праяўленай энэргіі і нас ойлівасьці, організаваў колгас, куды ўступіла 30 гаспадарак і сабраў 80 руб. на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў“. На сходзе колгасьнікаў новаорганізаванага колгасу, у сувязі з 13-й гадавінай Чырвонай арміі, Машынін організаваў ячэйку Асоавіяхэму, у якую ўступіла 45 чалавек.

Аб рабоце тав. Машыніна можна меркаваць па таму водгуку, які прыслалі з раёну: „Дзякуем камандаваньню за работу чырвонаармейца тав Машыніна і просім адпусьціць яго на дапамогу ў праведзеньні падрыхтоўчай работы да сяўбы.

Можна было-б прывесьці яшчэ шмат і шмат фактаў, але гэтага досыць для таго, каб зрабіць вывад: армейскія комсамольцы па-бальшавіцку дзяруцца за генэральную лінію партыі, настойліва выконваюць рашэньні комсамольскіх зьездаў.

Г. ШЫФРЫН.

Л. Шыф



Уноч на 8-IУ памёр ад цяжкай працяглай хваробы былы сябра бюро ЦК ЛКСМБ і стары комсамолец, актыві ты-комуністы—тав. Шыф Л.

У асобе тав. Шыфа Л. комсамольская організацыя Беларусі згубіла актыўнага, адданага справе рабочае клясы таварыша.

Тав. Шыф на працягу свайго знаходжаньня ў партыі і Ленінскім комсамоле быў запраўдным змагаром за правільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі ў рабоце комсаюзу Беларусі.

Тав. Шыф рос, выхоўваўся ў радох ЛКСМБ і з першага часу свайго ўступленьня ў рады комсамолу адразу акувуўся ў практычную работу па кіраўніцтву комсамольскай організацыяй.

Спачатку ён абіраецца сакратаром буйнейшага вытворчага колектыву зав. „Бальшавік“, потым, праз некаторы час, на раённай конфэрэнцыі б. Ляхаўскай організацыі абіраецца асноўным працаўніком РК, дзе працуе ў якасьці старшыні бюро піонэраў. Аднак, на гэтай працы ён быў ня доўга. ЦК ЛКСМБ адклікаў яго для работы нам. заг. орг. аддзелу, дзе т. Шыф і працаваў аддана па ўзмацненьню радоў беларускага комсамолу.

Праз некаторы час воляй партыі тав. Шыф быў перакінуты на важнейшы адказны фронт, гаспадарчую работу, дзе і прапаваў у якасьці дырэктара рымарнай ф-кі „Усход“. Тут тав. Шыф з уласьцівай яму энэргіяй аддаўся гаспадарчай рабоце па ліквідацыі прарываў, якія меліся на гэтай ф-цы.

Няцоўгае маладое жыцьцё тав. Шыфа было жыцьцём актывістага-бальшавіка на ўсім працягу прабываньня яго ў радох партыі і комсамолу.

Група таварышоў:
Палякоў, Гайдукевіч, Юрк'янец, Старобінец, Гасьперскі, Гуткін, Пацукоў. Пятровіч, Гуманаў, Райхельсон.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.
Друкарня імя тав. Сталіна
Галоўлітбел № 599